## § 13. Прыстаўка як значымая частка слова

**75.** Прачытайце верш.

Ад расы верасы пасівелі,
А ў бары галасы зазвінелі.[сн]
Баравік не прывык лезці ў вочы,
Адшукае грыбнік, як ахвочы.
*Р. Бензярук.*

Выпішыце з тэксту ў пачатковай форме роднасныя словы да дзеясловаў *сівець, звінець, шукаць*. Якой значымай часткай адрозніваюцца аднакаранёвыя словы? Ці змяняецца значэнне слоў пры яе далучэнні?

**Прыстаўка** — значымая частка слова, якая стаіць перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў: ***пера**скочыць, **за**ехаць, **пад**пісаць*.

**76.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай. Як вы разумееце сэнс мудрых слоў у апошнім сказе?

З ягаднай сям'і суніцы **паспяваюць** першыя. Яны **высыпаюць** у канцы чэрвеня. Збіраюць **суніцы**, калі **сплыве** туман і **ападзе** раса. Інакш яны памнуцца ў кошыку[с].

**Збіраць** суніцы — свята, а не работа.

Але **памятай** мудр.. слов..: «Ягаднік раз пашкадуеш — ён цяб.. дзесяць» *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.

Якія з выдзеленых слоў маюць прыстаўкі? Запішыце словы з прыстаўкамі і абазначце іх.

Спішыце апошні сказ, устаўляючы прапушчаныя літары. Абгрунтуйце свой выбар.

**77.** Прачытайце. Вызначце «чацвёртае лішняе» ў кожным радзе слоў. Па якой прымеце згрупаваны словы?

1. Адказ, адрас, адлёт, адліў.
2. Прышкольны, прыгарадны, прыдарожны, прыемны.
3. Выканаць, выдаліць, выжыць, вывучыць.

• З другога рада выпішыце словы з арфаграмай «Правапіс ***о, э, а***». Складзіце з імі сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**78.** Прачытайце тэкст. Чаму ён мае такую назву?

## Самалётны прыпынак

Рэйсавы самалёт Мінск — Кіеў ляціць над Аўцюкамі. Сцюардэса падбягае да лётчыка:

— Адчыніце люк, двое аўцюкоўцаў хочуць выйсці.

— Э-э, учора аднаго тут выпусціў, а трое ўскочылі... *(Паводле У. Ліпскага).*

Назавіце дзеясловы з прыстаўкамі. Падбярыце да іх словы з антанімічнымі прыстаўкамі. Запішыце дзеясловы парамі. Абазначце прыстаўкі.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы. Растлумачце іх значэнні.

**79.** Прачытайце. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Вызначце ў словах прыстаўкі.

| | |
|---|---|
| взбежать на крыльцо — ... | вскопать землю — ... |
| взлететь на веточку — ... | вбежать в комнату — ... |
| въехать в рощу — ... | вплести ленточку — ... |

Ад чаго залежыць напісанне зычнага на канцы прыстаўкі?
З адным словазлучэннем складзіце сказ.

**80.** Разгледзьце малюнак. Што на ім адлюстравана? Дзеясловы з якімі прыстаўкамі дапамогуць вам перадаць дзеянні?



Напішыце невялікае сачыненне на тэму «Восеньскі дождж», ужываючы дзеясловы з прыстаўкамі са значэннем ‘пачаць дзеянне’.

Для даведкі: *гром загрукатаў, вада палілася, вецер забушаваў, дождж забарабаніў, дрэвы нахіліліся, лісце зашалясцела, парасон сагнуўся, сабачка пабег.*

**81.** Прачытайце. Спішыце фразеалагізмы, устаўляючы ў словы неабходныя прыстаўкі.

Як пшаніцу ..даўшы; ..весці на чыстую ваду; ..рубіць сабе на носе; зубы ..гаворваць; костачкі ..мываць; ..ламаць дроў.

Які з прыведзеных выразаў мае значэнне ‘*вельмі моцна спаць*’?
Складзіце і запішыце сказ з адным фразеалагізмам (на выбар).


Правообладатель Национальный институт образования